І. ЛЕСЮКОВА
старшыня
цыклавой
камісіі
бібліятэка-
знаўства

# Напрамкі ўзаемадзеяння ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны бібліятэчны каледж імя А. С. Пушкіна» і бібліятэчных устаноў рэспублікі



Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны бібліятэчны каледж імя А. С. Пушкіна» — адзіная ў Рэспубліцы Беларусь установа адукацыі, якая на працягу 66 гадоў рыхтуе бібліятэчныя кадры сярэдняй кваліфікацыі для ўсіх рэгіёнаў краіны. Спецыялісты падрыхтоўваюцца для наступнай прафесійнай дзейнасці: бібліятэчнай, бібліяграфічнай, інфармацыйнай, арганізацыйна-кіраўнічай, арганізацыйна-вытворчай, культурна-асветніцкай.

Значная ўвага ў каледжы надаецца якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, іх адаптацыі і канкурэнтаздольнасці на рынку працы. Гэта прадугледжвае шматаспектную, паглыбленую работу выкладчыкаў па выяўленню і вывучэнню перспектыўнага перадавога вопыту айчынных і замежных бібліятэк праз навукова-даследчую і дыягнастычную работу, аналіз прафесійных выданняў, інфармацыйных рэсурсаў і сайтаў бібліятэк, удзел у рэспубліканскіх і міжнародных бібліятэчных форумах, школах, канферэнцыях.

Значнасць узаемадзеяння бібліятэчнага каледжа і бібліятэчных устаноў рэспублікі прадыктавана прыярытэтамі адукацыйнай палітыкі нашай дзяржавы, якая характэрна для ўсіх сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі:

- павышэнне якасці адукацыі;

- практыкаарыентаванасць у навучанні;
- падрыхтоўка канкурэнтаздольных, мабільных спецыялістаў;
- пастаянная сувязь з заказчыкамі кадраў.

У адпаведнасці з гэтымі задачамі наш выпускнік, малады спецыяліст, павінен без дадатковага навучання, адразу пасля прыбыцця на работу выконваць устаноўленыя працадаўцам прафесійныя патрабаванні, дэманструючы неабходныя веды і ўменні. Выпускнік бібліятэчнага каледжа павінен быць гатовы для выканання наступных прафесійных функцый:

— арганізоўваць работу бібліятэкі і здзяйсняць бібліятэчна-бібліяграфічную дзейнасць;

— камплектаваць бібліятэчныя фонды;

— здзяйсняць аналітыка-сінтэтычную апрацоўку дакументаў, іх захоўванне і распаўсюджванне;

— арганізоўваць, рэдагаваць і выкарыстоўваць каталогі і іншыя састаўныя часткі даведачна-бібліяграфічнага апарата;

— весці ўлік, справаздачу і планаванне работы бібліятэкі;

— выконваць бібліятэчную дзейнасць з выкарыстаннем сучасных інфармацыйных тэхналогій;

— здзяйсняць бібліятэчна-бібліяграфічнае і інфармацыйнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэкі і аказваць бібліятэчныя паслугі;

— ствараць, забяспечваць спрыяльныя ўмовы для эфектыўнага функцыянавання бібліятэкі;

— пашыраць наменклатуру бібліятэчных паслуг у адпаведнасці з запытамі карыстальнікаў і развіццём інфармацыйнай культуры насельніцтва;



— здзяйсняць культурна-асветніцкую дзейнасць.

Дзейнасць выкладчыкаў каледжа па ўдасканаленню якасці навучальнага працэсу накіравана на ўсталяванне адпаведнасці запытаў практыкаў-заказчыкаў кадраў і патрабаванняў адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», у якім вызначана назначэнне, структура, змест спецыяльнасці, абавязковы мінімум зместу адукацыі, патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў.

Выкладчыкі каледжа пры складанні тыпавых і вучэбных праграм, пры распрацоўцы лекцыйнага матэрыялу і практычных заданняў па бібліятэчнай спецыяльнасці ўлічваюць вынікі маніторынгаў па выяўленню запытаў і патрабаванняў практыкаў-працадаўцаў.

З 2008 года дырэктары публічных і спецыяльных бібліятэк запрашаюцца ў якасці старшыняў экзаменацыйнай камісіі дзяржаўнага экзамену па спецыяльнасці. Іх прапановы і заўвагі па падрыхтоўцы маладых кадраў пастаянна абмяркоўваюцца на метадычных, педагагічных саветах каледжа, пасяджэннях цыклавых камісій.

У практыцы навучальнай установы стала традыцыяй звяртацца да бібліятэчных спецыялістаў за рэцэнзаваннем праграмнага і комплекснага метадычнага забеспячэння, што дазваляе суаднесці тэарэтычны матэрыял да практычных патрабаванняў.

Супрацоўнікі бібліятэк запрашаюцца на метадычныя мерапрыемствы каледжа па абмеркаванні асноўных тэндэнцый развіцця бібліятэчнай справы і прыярытэтных патрабаванняў заказчыкаў кадраў да маладога спецыяліста, выпускніка сярэдняй спецыяльнай установы. Так, сярод апошніх мерапрыемстваў абмеркаванню са спецыялістамі значных праблем былі прысвечаны адкрытае паседжанне «Якасць падрыхтоўкі спецыялістаў», круглы стол «Роля інфармацыйных тэхналогій ў прафесійнай дзейнасці бібліятэкара», педагагічная панарама «Новае ў бібліятэчнай справе».

У снежні 2011 г. праведзены круглы стол «Тэрыторыя партнёрства: праблемы і перспектывы падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў у кантэксце ўзаемадзеяння ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны бібліятэчны каледж імя А. С. Пушкіна» і бібліятэк рэспублікі. У абмеркаванні глабальных пытанняў прынялі ўдзел загадчыца навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дырэктары абласных бібліятэк рэспублікі, дэкан факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, дырэктары цэнтралізаваных сістэм Мінска, Магілёва, Дрыбінскага, Клічаўскага, Крычаўскага, Асіповіцкага, Слаўгарадскага і іншых

раёнаў, дырэктары бібліятэк ВНУ, намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Беларуская бібліятэчная асацыяцыя» і інш.

У мэтах удасканалення вучэбнага працэсу, яго змястоўнага і інфармацыйнага насычэння на круглым стале былі разгледжаны пытанні: якасць падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў сярэдняга спецыяльнага звяна і развіццё пераемнасці сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай бібліятэчнай адукацыі; асноўныя тэндэнцыі развіцця бібліятэчнай справы і мадэрнізацыя прафесіі; прафарыентацыя і матывацыя моладзі на бібліятэчную прафесію; значэнне ББА ў кансалідацыі і павышэнні кваліфікацыі бібліятэчных кадраў; магчымасці сучаснай адукацыйнай прасторы ў сістэме дадатковай адукацыі бібліятэкараў-практыкаў і педагогаў.

Традыцыяй становіцца запрашэнне намесніка дырэктара па практычным навучанні бібліятэкараў на семінары кіраўнікоў практыкі з бібліятэк Магілёўскай вобласці. Гэта дае магчымасць падтрымліваць бесперапынную сувязь тэорыі з практыкай, знаёміцца з новымі напрамкамі і задачамі дзейнасці бібліятэк, цікавым вопытам работы, што пасля выкарыстоўваецца пры выкладанні спецыяльных дысцыплін і ў кіраўніцтве практыкай.

Умацаванню практыкаарыентаванасці навучэнцаў спрыяе практыка. Тэхналагічная практыка праходзіць на базах бібліятэк горада Магілёва, а пераддыпломная — у бібліятэках краіны, куды накіроўваюцца навучэнцы, як правіла, па месцы жыхарства. Выкладчыкамі распрацаваны цыкл заняткаў, якія праходзяць на базах бібліятэк (урокі на вытворчасці), што спрыяе набліжэнню тэарэтычнага матэрыялу да практычнай дзейнасці. Пэўнае месца ў абранай прафесіі надаецца аглядным і тэматычным экскурсіям ў бібліятэкі рэспублікі рознай ведамаснай прыналежнасці: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Магілёўская абласная навукова-тэхнічная бібліятэка, бібліятэкі ВНУ, публічныя бібліятэкі Магілёўскай вобласці, у тым ліку бібліятэкі аграгарадкоў, і інш.

Немалаважную ролю ў навучанні надаецца прынцыпу нагляднасці. Для нашай установы адукацыі — гэта метадычныя, інфармацыйныя, аналітычныя і іншыя матэрыялы, справаздачна-плануючая дакументацыя бібліятэк. Выкарыстанне дадзенага матэрыялу ў навучальным працэсе спрыяе не толькі нагляднасці ў выкладанні, але і магчымасці адсочваць выкладчыкам і навучэнцам мадэрнізацыю, асноўныя тэндэнцыі бібліятэчнай практыкі.

**Эфектыўнасці ўзаемадзеяння навучальнай установы і практыкаў садзейнічае ўсталяванне дамоўных узаемаадносін і праектаў.**

Так, распрацаваны праект «Бібліятэка-каледж», у рамках якога выпрацаваны задачы, напрамкі ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва бібліятэк горада Магілёва і каледжа, прадугледжаны ўдзел навучэнцаў і выкладчыкаў у падрыхтоўцы і правядзенні масавых сацыяльна-культурных і інфармацыйна-асветніцкіх мерапрыемстваў. Праект спрыяе выхаванню ў вучняў актыўнай грамадзянскай пазіцыі, фарміраванню лідэрскіх і маральна-этычных якасцей, пачуцця патрыятызму і інш. Найбольш цікавыя мерапрыемствы з практычнай значнасцю, што прайшлі ў рамках праекта, — флэш-мобы, прысвечаныя Дню бібліятэк і Тыдню дзіцячай і юнацкай кнігі; святы кніг на вуліцах горада Магілёва; акцыя «Чарга ў бібліятэку». У рамках праекту распрацаваны план работы валанцёраў-навучэнцаў з мэтай іх прафесійнага развіцця і сацыяльнай самарэалізацыі шляхам азнаямлення з рознымі відамі сацыяльнай актыўнасці і ўключэннем у добраахвотніцкі рух.

Актуальныя і значныя для нашых навучэнцаў два праекты, створаныя супрацоўнікамі Магілёўскай абласной бібліятэкі. Праект па духоўнаму выхаванню моладзі «Бібліятэка і маральнае выхаванне ў кантэксце праваслаўных традыцый» спрыяе сацыялізацыі моладзі, фарміраванню ў іх эмпатыі, духоўнай культуры. Другі праект «Узыходжанне па прыступках права» распрацаваны з мэтай фарміравання прававой і палітычнай культуры навучэнцаў, для больш дэталёвага навучання іх пошуку прававых дакументаў у Эталонным банку дадзеных і ў сетцы Інтэрнэт як будучых супрацоўнікаў ПЦПІ.

З дырэктарам Шклоўскай бібліятэчнай сістэмы распрацавана пагадненне аб правядзенні тэматычных заняткаў, экскурсій па экалагічнаму і краязнаўчаму напрамках работы бібліятэк раёна, а таксама вывучэнню вопыту работы народнага аматарскага калектыву «Фларыяда» і ўзорнага аматарскага калектыву «Бусляня» і інш.

Значным для выкладчыкаў каледжа стаіць пытанне распрацоўкі новых грунтоўных сумесных навукова-даследчых, адукацыйных, камерцыйных і іншых праектаў з бібліятэкамі краіны. *Калі ў крэатыўных спецыялістаў бібліятэчнай справы любога рэгіёну Беларусі ёсць слушныя меркаванні і прапановы па дадзенай праблеме, то выкладчыкі каледжа з задавальненнем падтрымаюць прагрэсіўныя ідэі па ўсталяванню партнёрскіх ўзаемаадносінаў.*

На якасць падрыхтоўкі навучэнцаў уплывае іх матывацыйны настрой на прафесію. Так, на завочнае аддзяленне каледжа паступаюць ужо працуючыя па спецыяльнасці, а значыць гатовыя набываць і засвойваць веды. На дзённае аддзяленне мэтанакіравана паступае 30–40% навучэнцаў. Па дадзеным анкетаванняў, каля 60% навучэнцаў ніколі

раней і не думалі набываць бібліятэчную прафесію, а паступілі ў каледж таму, што не прайшлі па конкурсу ў ВНУ. У такім выпадку самае галоўнае — зацікавіць навучэнцаў, сфарміраваць павагу да прафесіі, развіць прафесійную свядомасць. Прафарыентацыі ў навучальнай установе надаецца велізарная ўвага. Аднак непараўнальна найбольшы эфект — узровень матывацыі абітурыентаў — залежыць і ад пазіцыяніравання бібліятэкамі сутнасці бібліятэчнай прафесіі, яе мадэрнізацыі, а таксама іх мэтанакіраванай агітацыі, пошуку і падборы кадраў сярод выпускнікоў школ. *Пажадана, каб бібліятэкі размясцілі на сваіх старонках у Інтэрнэце спасылкі на сайт каледжа mgbk.mogilev.by.* Ад своечасовай сумеснай прафарыентаванай работы працадаўцаў і навучальнай установы залежыць, у некаторай ступені, і кадравая палітыка бібліятэчных устаноў. Матываваны абітурыент будзе старанным вучнем, а потым прафесійна кампетэнтным спецыялістам, які жадае атрымаць вышэйшую бібліятэчную адукацыю.



Аб якасці падрыхтоўкі выпускніка сведчаць не толькі адзнакі вучняў у дыпломе, але і меркаванне заказчыкаў кадраў аб ведах, уменнях і навыках маладога спецыяліста. Штогод сярод навучэнцаў выпускных груп праходзяць конкурсы прафесійнага майстэрства з мэтай ацэнкі іх прафесійнай падрыхтоўкі. У якасці членаў журы і экспертаў запрашаюцца супрацоўнікі бібліятэк. Нашы навучэнцы прымаюць ўдзел у гарадскіх і абласных конкурсах, маладзёжных форумах.

Ацэнка працы выкладчыкаў разглядаецца і як паспяховасць нашых навучэнцаў на працоўных месцах. Ва ўстанове адукацыі вядзецца база дадзеных водгукаў аб выпускніках каледжа. Водгукі аб прафесійнай кампетэнцыі, асабістых якасцях навучэнцаў з'яўляюцца для выкладчыкаў каштоўным матэрыялам для карэкціроўкі вучэбна-выхаваўчага працэсу.

У мэтах удасканалення якасці падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў сярэдняй спецыяльнай адукацыі неабходна далейшае супрацоўніцтва тэорыі і практыкі па вышэй вызначаных напрамках.

Запрашаем бібліятэчных спецыялістаў прымаць актыўны ўдзел пры абмеркаванні надзённых праблем бібліятэчнай справы на *сайце камісіі бібліятэказнаўства mgbk.org і на форуме «Бібліятэказнаўца» libraved.mypage.su.*